# УПЛЫЎ ВАЕННАЙ КАНФРАНТАЦЫІ З ВЯЛІКІМ КНЯСТВАМ МАСКОЎСКІМ НА ПРЫЯРЫТЭТЫ ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫКІ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў КАНЦЫ XV – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVI ст.

Мікалаева Л.В., БДУІР

Канец XV – першая палова XVI ст. – пераломны момант у гісторыі не толькі ВКЛ, але і ўсёй еўрапейскай цывілізацыі. Гэта быў час вялікіх геаграфічных адкрыццяў і зараджэння капіталістычных адносін, час пачатку ўзнікнення абсалютных манархій і зараджэння нацыянальных дзяржаў. З канца XV ст. Еўропа ўступіла і ў новы перыяд міжнародных адносін. У гэты час пачаў завязвацца шэраг вузлоў міжнародных супярэчнасцей, якія пагражалі войнамі. Па-першае, гэта было сутыкненне інтарэсаў Іспаніі, з аднаго боку, і Францыі і Англіі, з другога, якое вылілася ў канцы XV – першай палове XVI ст. у Італьянскія войны (1494 – 1559 гг.). Па-другое, узаемаадносіны еўрапейскіх дзяржаў з Асманскай імперыяй, якая працягвала сваю экспансію ў Еўропу. Па-трэцяе, барацьба паміж краінамі Паўночнай Еўропы за панаванне на Балтыцы. На такім фоне разгортваліся падзеі, якія склалі асноўны змест знешняй палітыкі ВКЛ гэтага перыяду, і, фактычна, чацвёрты вузел міжнародных супярэчнасцей. Сутнасць яго склала супрацьстаянне дзвюх найбуйнейшых дзяржаў усходнееўрапейскага рэгіёна – Вялікага Княства Маскоўскага і Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ). Перманентнае ваенна-палітычнае змаганне за гегемонію ў рэгіёне, у якое перараслі ліцвінска-маскоўскія адносіны, не прайшло незаўважаным і для іншых дзяржаў-суседзяў, паколькі фактычна ўсе яны ў той ці іншай ступені аказаліся ўцягнутыя ў гэты канфлікт.

Такім чынам, з канца XV ст. прыярытэтным у знешняй палітыцы ВКЛ становіцца менавіта ўсходні кірунак, на якім і разгортваліся важнейшыя падзеі. Тут ВКЛ падтрымлівала стасункі толькі з адной дзяржавай, Вялікім Княствам Маскоўскім, і менавіта гэта суседства стала галоўнай крыніцай знешнепалітычных праблем ВКЛ, адначасова адцягваючы асноўную ўвагу як дыпламатаў, так і ваенных і прама ці ўскосна ўплываючы на развіццё адносін з астатнімі суседзямі. Асноўны змест ліцвінска-маскоўскіх адносін склалі як адкрытыя ваенныя дзеянні на памежжы і ўсходніх землях ВКЛ, так і шэраг дыпламатычных і ідэалагічных акцый і крокаў. Асноўнай мэтай дзейнасці дыпламатыі ВКЛ на гэтым накірунку была нейтралізацыя Вялікага Княства Маскоўскага і дасягненне status quo.

Між тым, да канца XV ст. Вялікае Княства Маскоўскае, увабраўшыся ў сілу і пазбавіўшыся татарскага ярма (1481 г.), у сутык падыйшло да межаў ВКЛ. Паміж гэтымі вядучымі краінамі Усходняй Еўропы пачала разгортвацца барацьба за палітычнае лідэрства ў рэгіёне, якая суправаджалася прад'яўленнем маскоўскім бокам прэтэнзій на т. зв. "рускія" землі – абшары, населеныя пераважна праваслаўным ("рускім" па тагачаснай

Библиотека БГУИР

тэрміналогіі) насельніцтвам, якія ў IX – XIII стст. уваходзілі ў сістэму княстваў Русі. Пры гэтым маскоўскі бок для абгрунтавання сваіх правоў на гэтыя тэрыторыі выкарыстоўваў два асноўныя аргументы: рэлігійнае першынства і прыналежнасць сваіх уладароў да дынастыі Рурыкавічаў. Справа ў тым, што ў выніку доўгага існавання саюза паміж свецкай і духоўнай уладай Маскоўскай дзяржавы афіцыйная ідэалогія Вялікага Княства Маскоўскага фактычна стала царкоўнай і маскоўскія ўладары разглядаліся ёю як уладары ўсяго праваслаўнага хрысціянства. Вялікія князі літоўскія, зразумела, адхілялі ўсялякія прэтэнзіі Вялікага Княства Маскоўскага на ўсходнія землі ВКЛ. Такім чынам, у канцы XV ст. пачаў завязвацца значны вузел міжнародных супярэчнасцей на ўсходзе Еўропы, якія выліліся ў шэраг амаль бесперапынных маскоўска-ліцвінскіх войнаў.

Прычым да першых войнаў вялікі князь маскоўскі Іван III падрыхтаваўся значна лепш за ліцвінскі бок, стварыўшы магутную антыягелонскую кааліцыю ў складзе Маскоўскай дзяржавы, Крымскай (Перакопскай) арды, Малдаўскага княства, да якой таксама маглі далучыцца Мазовія, Тэўтонскі Ордэн і імперыя Габсбургаў [2, с. 254; 5, с. 68 – 69; 9, с.122; 16, с. 166]. Сам факт стварэння азначанай кааліцыі, на наш погляд, можна разглядаць як прыватны выпадак дзеяння сістэмы палітычнай раўнавагі, што пачала наладжвацца ў агульнаеўрапейскім маштабе і рабіла немагчымым існаванне дзяржавы-гегемона ў пэўным рэгіёне.

ВКЛ спрабавала абаперціся толькі на Польшчу – свайго даўняга саюзніка па ўніі. Аднак адносіны з ёй таксама былі сапсаваны выбраннем розных уладароў на троны ВКЛ і Кароны пасля смерці Казіміра Ягелончыка ў 1492 г. Пасля таго, як на пасад у Вільні ўзыйшоў вялікі князі Аляксандр, а на трон у Кракаве – кароль Ян Ольбрахт, асабістая ўнія паміж Польшчай і ВКЛ перастала існаваць, ператварыўшыся ў унію дынастычную.

Пачатку першай маскоўска-ліцвінскай вайны 1492 – 1494 гг. папярэднічала т. зв. "дзіўная вайна" [4, с. 93 – 109], якая суправаджалася "ад'ездамі" шэрагу "вярхоўскіх" князёў (Варатынскіх, Бялеўскіх, Мязецкіх, Вяземскага і інш.) на службу да вялікага князя маскоўскага Івана III Васільевіча разам са сваімі вотчынамі. Справа ў тым, што па ўмовах дагавораў, якія "вярхоўскія" князі ў свой час заключылі з вялікім князем літоўскім Вітаўтам Кейстутавічам, за некаторымі з іх захоўвалася права "служить на обе стороны", г. зн. і на баку ВКЛ, і на баку Вялікага княства Маскоўскага. Да таго моманту, пакуль ВКЛ дамінавала ў рэгіёне, гэтыя князі захоўвалі вернасць вялікім князям літоўскім. Але ў канцы XV ст. сітуацыя змянілася, і "вярхоўскія" князі пачалі схіляцца на бок тых уладароў, якія маглі рэальна гарантаваць ім бяспеку. У гэты час пачасціліся наезды крымскіх татар, саюзнікаў Івана III, на землі ВКЛ, у т. л. татарскія загоны з'яўляліся на гэтых абшарах. Заходзілі сюды і атрады Вялікай Арды, ханы якой па старой звычцы часам патрабавалі даніну на сваю карысць з мясцовых князёў. Апошнія таксама добра разумелі, што іх чакае ў выпадку пачатку ваенных дзеянняў паміж дзяржавамі. У такой сітуацыі чакаць хуткай дапамогі ад ліцвінскіх улад не даводзілася з прычыны адсутнасці ў дзяржаве

Библиотека БГУИР

сталага войска. На збор жа паспалітага рушання патрабаваўся час. Пратрымацца са сваімі дробнымі дружынамі да падыходу асноўных сіл земскага апалчэння мясцовыя князі не маглі. Таму становіцца зразумелы іх выбар на карысць больш актыўнага маскоўскага боку. Разам з тым, у гэты час можна было назіраць і такую з'яву, што частка прадстаўнікоў княжацкіх родаў, сваякі якіх перайшлі на маскоўскі бок, заставаліся вернымі ВКЛ. Гэтыя факты сведчылі аб тым, што паміж ВКЛ і Вялікім Княствам Маскоўскім у гэты час існавала прыкладная раўнавага сіл, проста адны князі лічылі, што бяспеку ім можа забяспечыць маскоўскім бок, а іншыя – што бок літоўскі [6, с. 80].

З 1487 г., калі адбыўся першы "ад'езд" (князь Іван Варатынскі перайшоў на бок Вялікага Княства Маскоўскага разам са сваёй вотчынай Перамышлем і падуладным яму насельніцтвам [17, с. 3 – 5]) можна казаць пра маскоўска-ліцвінскую памежную вайну, якая набыла характар наездаў, рабункаў і разбояў, ажыццяўляемых абодвума бакамі. З 1492 г. яны перараслі ў адкрыты міждзяржаўны ваенны канфлікт, які закончыўся ў 1494 г., калі 17 студзеня у Маскву прыбыло "вялікае пасольства" вялікага князя літоўскага Аляксандра, у склад якога ўваходзілі троцкі ваявода Пётр Янавіч Мантыгірдавіч, жамойцкі староста Станіслаў Янавіч Кезгайла, Войтка Яновіч і пісар Федзька Грыгор'еў. У выніку быў падпісаны "вечны мір", па ўмовах якога ВКЛ панесла першыя тэрытарыяльныя страты ў выглядзе часткі "вярхоўскіх" княстваў і ўсёй Вяземшчыны. Дакладная мяжа тут вызначана не была, што пакідала падставы для будучых канфліктаў. Акрамя таго ВКЛ адмовілася ад сваіх правоў на шэраг рускіх зямель, на якія яно мела свой ўплыў у мінулым: Вялікі Ноўгарад, Пскоў, Цвер і Разань. Гэта азначала прызнанне ліцвінскім бокам пераходу названых зямель пад уплыў Маскоўскай дзяржавы [10, арк. 209 – 211 адв.]. Мір быў замацаваны шлюбам вялікага князя літоўскага Аляксандра з дачкой вялікага князя маскоўскага Івана III Аленай. У якасці пасагу Алены былі вызначаны ўсе "рускія" землі, якімі валодала ВКЛ.

Але дынастычны шлюб не вырашыў усіх супярэчнасцяў і, нават, як паказалі далейшыя падзеі, выкарыстоўваўся Іванам III для інспіравання новых зачэпак для вайны з ВКЛ. Чарговая маскоўска-ліцвінская вайна ўспыхнула ўжо ў 1500 г. Фармальнай зачэпкай да яе з'явіліся раздутыя маскоўскай прапагандай пытанні аб быццам бы маючых месца праследваннях праваслаўнага насельніцтва ВКЛ і аб новым тытуле маскоўскага вялікага князя – "государь всея Руси", які не прызнаваўся ліцвінскай дыпламатыяй і палітычнымі дзеячамі, бо ў ім справядліва бачыўся непрыхаваны замах на дзяржаўную цэласнасць ВКЛ.

Гэты ваенны канфлікт зноў-такі пачаўся з "ад'ездаў" памежных князёў з ВКЛ у Вялікае Княства Маскоўскае, якія, па афіцыйных версіях, быццам бы ратаваліся ад ганенняў на праваслаўных. Сапраўдныя ж матывы "ад'ездаў" раскрыў, як падаецца, дасведчаны аўтар "Хронікі Быхаўца", па словах якой, маскоўскі вялікі князь Іван III пасылаў "таемне" да князёў Сямёна Іванавіча Бельскага, Сямёна Іванавіча Мажайскага і Васіля Іванавіча Шамячыча,

Бібліятэка БГУІР

прапаноўваючы перайсці да яго на службу, “а ку тому ешче обецал им многие городы ы волости свои”. Пагадненне прадугледжвала, што “которые городы и волости они под Литвою поберут, то им и державати” [19, с. 166]. Статус гэтых князёў-перабежчыкаў быў ужо іншы, чым у “вярхоўскіх” князёў, якія ў большасці былі князямі ўдзельнымі. Вясной 1500 г. “ад’ехалі” князі-намеснікі, а захопленыя імі землі з’яўляліся пажалаваннямі вялікіх князёў літоўскіх. Да таго ж першы з іх, князь Сямён Бельскі, сам паходзіў з дынастыі Гедымінавічаў (унук князя Уладзіміра Альгердавіча), а двое апошніх з’яўляліся маскоўскімі палітычнымі эмігрантамі, прадстаўнікамі дынастыі Рурыкавічаў, якія ў свой час знайшлі прытулак у ВКЛ. Таму іх дзеянні можна, у адрозненне ад падзей першай вайны, адназначна разглядаць як здраду дзяржаўным інтарэсам ВКЛ.

У красавіку 1500 г. у Маскву прыехала ліцвінскае пасольства на чале са смаленскім намеснікам Станіславам Пятрашкавічам Кішкам, якое імкнулася зняць напружанне паміж дзяржавамі. Вялікі князь Аляксандр пайшоў на кампраміс і ўпершыню звяртаўся ў паперах да вялікага князя маскоўскага Івана ІІІ як да “государя всея Руси”, патрабуючы вярнуць “здрадцаў” (князёў-перабежчыкаў) і не чыніць больш крыўд на межах. Але Іван ІІІ усю віну пераклаў на Аляксандра, абвінаваціўшы яго ў ганеннях на праваслаўных і прымусе вялікій княгіні Алены да прыняцця каталіцтва і выслаўшы назад ліцвінскіх паслоў, накіраваў у ВКЛ сваё войска [17, с. 296 – 300]. 3 мая 1500 г. ваявода Якаў Захар’ін з палкамі рушыў на Бранск. Толькі пасля гэтага ў Вільню быў адпраўлены ганец Іван Целяшоў з граматай, у якой абвяшчалася, што Іван ІІІ “за християнство хочет стояти” і пачынае вайну. Войска Захар’іна тым часам авалодала Бранскам, заняло Пуціўль, Мцэнск, Сярпейск, Старадуб, Гомель, Любеч, Ноўгарад-Северскі, Рыльск. На бок Масквы перайшлі князі Масальскія і Трубяцкія [2, с. 451]. Другая групоўка войск на чале з Юрыем Захар’іным была накіравана да Смаленска, на Дарагабуж. Трэцяя групоўка стаяла напагатове ў Вялікіх Луках, а чацвёртая – у рэзерве ў Цверы. У канцы чэрвеня да Смаленска падышоў конны корпус ВКЛ пад камандаваннем найвышэйшага гетмана князя Канстанціна Іванавіча Астрожскага. 14 ліпеня 1500 г. 4-тысячны атрад гетмана атакаваў на р. Вядроша пад Дарагабужам аб’яднаныя сілы маскоўскіх ваявод (40 тыс. чалавек) і ў жорсткай 6-гадзіннай бітве быў амаль цалкам знішчаны. Князь Астрожскі з часткай войска трапіў у палон, а ВКЛ апынулася ў цяжкім ваенна-палітычным становішчы, бо яго асноўныя сілы былі разбіты [19, с. 167; 4, с. 185 – 186].

Дыпламатыі ВКЛ удалося стварыць антымаскоўскую кааліцыю, у якую акрамя ВКЛ увайшлі яшчэ Вялікая (Заволжская) Арда і Лівонскі ордэн. Аднак ліцвінскі бок не здолеў скарыстацца спрыяльнымі момантамі ад гэтага супрацоўніцтва. Летам 1501 г. ардынцы адваявалі шэраг гарадоў на Севершчыне, якія раней належалі ВКЛ. Аднак для таго, каб перадаць іх назад, патрабавалася прысутнасць ліцвінскага войска, бо доўга іх утрымліваць стэпавікі не маглі. У маі 1501 г. пачаў ваенныя дзеянні супраць Вялікага Княства Маскоўскага і магістр Лівонскага ордэна Вальтэр фон

Библиотека БГУИР

Плетэнберг. Але вялікі князь Аляксандр, заняты справамі ў Польшчы (у гэты час памёр яго брат Ян-Ольбрахт і Аляксандр удзельнічаў у барацьбе за польскую карону) не змог аказаць дапамогу саюзнікам [8, с. 143]. У выніку сітуацыя склалася так, што сілы кааліцыі былі разбіты паасобку.

Другая маскоўска-ліцвінская вайна доўжылася да 1503 г. і закончылася падпісаннем шасцігадовага перамір'я, якое замацавала чарговыя змены на ліцвінска-маскоўскай мяжы. Да Вялікага Княства Маскоўскага адышлі: рэшта вярхоўскіх княстваў (Мцэнск, Масальск, Сярпейск, Любуцк); Чарнігава-Старадубскае княства (Чарнігаў, Старадуб, Гомель); Ноўгарад-Северскае княства (Ноўгарад-Северскі, Рыльск); паўднёвая, паўночная і ўсходняя часткі Смаленшчыны (Бранск, Трубчэўск, Радагошч, Почап, Дарагабуж, Тарапец, Белая і інш.); частка Кіеўшчыны (Любеч, Пуціўль); паўднёвая частка Мсціслаўскага княства (Хоцімль, Папова Гара, Мглін); паўночна-ўсходняя частка Віцебскай (Веліж) і Полацкай (Невель, Остры) зямель [10, арк. 272 адв. – 275; 17, с. 412 – 439]. Названыя абставіны рэзка змянілі суадносіны сіл у рэгіёне на карысць Вялікага Княства Маскоўскага. Гэта рабіла непазбежнай новую вайну з Маскоўскай дзяржавай, тым больш што мірныя ініцыятывы ліцвінскага боку не знаходзілі падтрымкі ў Маскве.

Новая ваенная кампанія была распачата пераемнікам Івана III вялікім князем маскоўскім Васілём III Іванавічам у 1507 г., калі яшчэ не выйшаў тэрмін шасцігадовага перамір'я, заключанага ў 1503 г. Ёй папярэднічала напружаная дыпламатычная падрыхтоўка, калі новы вялікі князь літоўскі і кароль польскі Жыгімонт Казіміравіч спрабаваў аб'яднаць для барацьбы з Маскоўскай дзяржавай сілы ВКЛ, Польшчы [11, арк. 15, 184 – 186], Лівоніі [1, с. 13 – 14; 7, с. 78 – 80], Крымскага [11, арк. 9 – 13, 16] і Казанскага ханстваў [11, арк. 22 – 24, 27 – 31; 12, арк. 32 адв. – 33] і наладзіць зносіны з братам вялікага маскоўскага князя Юрыем Іванавічам [1, с. 20 – 21], спрабуючы дэстабілізаваць унутрыпалітычнае становішча ў Вялікім Княстве Маскоўскім шляхам падрыхтоўкі змовы з мэтай адхілення Васіля III ад улады. У выніку рэальная дапамога была атрымана толькі ад Польшчы. Вайна 1507– 1508 гг., цесна звязаная на апошнім этапе з мяцяжом князя Міхаіла Львовіча Глінскага, усемагутнага фаварыта вялікага князя літоўскага Аляксандра, які трапіў у няміласць пры Жыгімонце Старым [3, с. 70 – 73], скончылася так званым "вечным мірам", заключаным восенню 1508г., які замацоўваў страты ліцвінскага боку на перыяд 1503 г. за невялікім выключэннем, бо ВКЛ быў вернуты Любеч [7, с. 125 – 128]. Гэты факт меў палітычнае і ваеннае значэнне. Упершыню ВКЛ адшукала частку страчаных зямель. Гэта быў псіхалагічны і прэстыжны поспех. Вялікае Княства Маскоўскае са стратай Любеча было адкінута ад лініі Дняпра – праўда толькі на 3–4 мілі – што мела пэўнае ваеннае значэнне. Адначасова палепшылася стратэгічнае становішча Кіева, для якога, аднак, працягвала існаваць пагроза ў выпадку маскоўскай атакі.

Аднак вялікі князь маскоўскі Васіль III ужо восенню 1512 г. сваім смаленскім паходам парушыў "вечны мір", паклаўшы пачатак чарговай маскоўска-ліцвінскай вайне, якая доўжылася да 1522 г. Да яе пачатку мелі

Библиотека БГУИР

дачыненне не толькі наезды часовага саюзніка Жыгімонта Старога крымскага хана Менглі-Гірэя на Маскву, але і варожая Ягелонам палітыка імператара Максіміліяна I Габсбурга, які прыклаў усе намаганні да стварэння кааліцыі ў складзе Свяшчэннай Рымскай імперыі германскай нацыі, Вялікага Княства Маскоўскага і Тэўтонскага ордэна, з магчымым далучэннем да яе Лівонскага ордэна, Саксоніі, Брандэнбурга і Даніі, асноўны ўдар якой накіроўваўся па ўладаннях караля польскага і вялікага князя літоўскага Жыгімонта Казіміравіча [18, 124 – 125; 20, p. 621].

У ВКЛ саюзнікаў амаль не было, бо на Венгрыю і Чэхію, дзе кіравалі прадстаўнікі дынастыі Ягелонаў, цяжка было разлічваць, хану Менглі-Гірэю пагражалі нагаі, а Польшча займалася абвастрыўшайся справай з Тэўтонскім ордэнам і намагалася за сваю дапамогу атрымаць ад ВКЛ пацвярджэнне інкарпарацыйнай Мельніцкай уніі 1501 г. [11, арк. 510]. Таму дапамога польскага боку абмежавалася наймам за грошы некалькіх тысяч жаўнераў [11, арк. 514 – 516, 530; 8, с. 199 – 200].

Падчас вайны адбыўся шэраг значных падзей, дзве з якіх не толькі паўплывалі на ўзаемаадносіны дзвюх краін, але і выклікалі еўрапейскі рэзананс. Гаворка ідзе пра захоп маскоўскімі войскамі Смаленска 31 ліпеня 1514 г. і паражэнне маскоўскіх атрадаў 8 верасня 1514 г. пад Оршай ад удвая меншага земскага апалчэння ВКЛ, узмоцненага атрадамі польскіх наёмнікаў. Захоп Смаленска азначаў канчатковую страту раўнавагі сіл у рэгіёне. З гэтага часу перавага была на баку Вялікага Княства Маскоўскага, якое ў 1514 г. заключыла антыягелонскі саюз з імператарам Максіміліянам I (ад якога апошні адступіў ужо ў 1515 г.) [15, арк, 14; 20, p. 621]. Затое перамога войска ВКЛ пад Оршай, якая разглядалася пры двары Жыгімонта Старога як рэванш за страту Смаленска, стварыла магчымасць выкарыстання знешнепалітычнай прапаганды як важнага ідэалагічнага сродка ў справе барацьбы за прыхільнае да ВКЛ меркаванне ў краінах Еўропы і выкрыццё ролі імператара Максіміліяна Габсбурга ў справе распальвання варожасці паміж хрысціянскімі ўладарамі [20, p. 623].

Пасля адзначаных падзей вайна цягнулася без рашучага змагання і ў выніку шэрагу няўдалых спроб ліцвінскіх дыпламатаў заключыць мір, асноўнай умовай якога было вяртанне ўсіх захопленых раней тэрыторый ВКЛ (восень 1517 г. – пасольства магілёўскага намесніка Яна Шчыта і пісара Міхала Богуша Багавіцінавіча пры пасрэдніцтве імператарскага ўпаўнаважанага Жыгімонта Герберштэйна [15, арк. 1 – 57], жнівень 1520 г. – пасольства падляшскага ваяводы Яна Косцевіча і падскарбія Міхала Богуша Багавіцінавіча [15, арк. 98 – 130]) скончылася падпісаннем пяцігадавога перамір’я, якое 14 верасня 1522 г. заключыла ў Маскве ліцвінскае пасольства ў складзе полацкага ваяводы Пятра Станіслававіча Кішкі, падскарбія Міхала Богуша Багавіцінавіча і пісара Івана Гарнастая [11, арк. 871 – 879]. Перамір’е замацавала межы 1508 г., але са значным выключэннем, бо Смаленск застаўся за Маскоўскай дзяржавай. ВКЛ захавала за сабой шматлікі маскоўскі палон [1, с. 148 – 150; 15, арк. 211 – 217]. Аднак мір так і не быў падпісаны з-за спрэчак наконт Смаленска. Таму перамір’е было прадоўжана

Бібліятэка БДУІР

ў 1527 і 1532 гг. Са стратай Смаленска дасягненне былой раўнавагі з Вялікім Княствам Маскоўскім стала амаль немагчымым.

Чарговае перамір'е трывала толькі да 1534 г., калі пасля смерці Васіля III ВКЛ упершыню за разглядаемы перыяд выступіла ініцыятарам ваеннага канфлікта, маючы намер, скарыстаўшыся спрыяльнай сітуацыяй (смерць вялікага князя маскоўскага Васіля III у 1533 г. і выспяваўшы ўнутраны разлад у Маскве пры малалетнім Іване IV), вярнуць тэрытарыяльныя страты. На працягу 1535 г. аб'яднанае ліцвінска-польскае войска здолела дасягнуць значнага поспеху, заняўшы амаль усю Севершчыну [14, арк. 61 – 77], аднак замацаваць гэты поспех не здолелі. Вайна закончылася падпісаннем 16 лютага 1537 г. пяцігадовага перамір'я па прынцыпу uti possidetis: за ВКЛ застаўся Гомель, да Вялікага Княства Маскоўскага адышлі Себеж і Завалочча [13, арк. 189 – 194]. Вяртанне Гомельшчыны мела важнае значэнне, бо ўтвораны ў выніку гэтага ліцвінскі клін, які выбіваўся ў северскія землі, быў добрым пунктам для далейшага працягу ліцвінскай экспансіі ў гэтым рэгіёне. Вялікае Княства Маскоўскае было адсунута ад лініі Дняпра і перастала непасрэдна пагражаць Кіеву. Між тым страчаныя Себеж і Завалочча, дзе падданыя вялікага князя маскоўскага Івана IV пабудавалі моцныя замкі, былі добрымі пунктамі для нападу на Полаччыну. Такім чынам, у выніку чатырох маскоўска-ліцвінскіх і адной ліцвінска-маскоўскай войнаў ВКЛ страціла прыкладна 39% тэрыторыі, галоўным чынам у Задняпроўі і на поўнач ад яго.

Як паказалі далейшыя падзеі, новае перамір'е, якое працягвалася ў 1542, 1549, 1553, 1556 гг., не прадухіліла далейшага напружання ў адносінах паміж дзяржавамі. У канцы 50-х гг. XVI ст. намеціўся новы віток супрацьстаяння, звязаны з лівонскім пытаннем, які прывёў да чарговай вайны.

Рэзюмуючы, можна сказаць, што дамінуючым фактарам у ліцвінска-маскоўскіх адносінах канца XV – сярэдзіны XVI ст. з'яўляліся войны, якія абумовілі і змены дзяржаўнай мяжы на гэтым абшары. Трэба падкрэсліць, што ў названы перыяд абедзве дзяржавы заключылі толькі дзве мірныя дамовы (у 1494 г. і 1508 г.), нягледзячы на тое, што было пяць войнаў. Іншымі словамі, часцей падпісваліся кароткія перамір'і, якія абодва бакі разглядалі як перадышкі, як перыяды для падрыхтоўкі да новай вайны ў найбольш спрыяльны для сябе момант. Таму не здзіўляе факт, што нават пад час перамір'яў (1503 – 1507, 1522 – 1534, 1537 – 1559 гг.) ці фармальнага існавання "вечнага міру" (1494 – 1500, 1508 – 1512 гг.) на парадку дня заставаліся працяглыя памежныя спрэчкі, маючыя характар грабяжоў і заняцця памежных зямель. Прадметам спрэчак быў таксама гвалт над купцамі, які працягваў мець месца з абодвух бакоў, нягледзячы на тое, што адной з умоў усіх падпісаных за гэты перыяд мірных і перамірных трактатаў была дэкларацыя свабоды гандлю. У такіх абставінах магчымасці развіцця іншых аспектаў ліцвінска-маскоўскіх адносінаў (гандаль, сфера культуры) былі вельмі абмежаваныя. А з сярэдзіны XVI ст. дзяржавы зноў уступілі ў чарговы ваенны канфлікт, працягваючы тым самым ужо склаўшуюся палітычную лінію на жорсткую канфрантацыю, выключаўшую магчымасць

Бібліятэка БГУІР

мірнага вырашэння праблем.

Літаратура


1.Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею: В 5 т. – СПб.: Тип. II отделения собств. Е. И. В. канцелярии, 1848. – Т. 2: 1506 – 1544. – III, 405, [ 39 ] с.

2.Базилевич, К.В. Внешняя политика Русского централизованного государства: Вторая половина XV века/ К.В. Базилевич. – М.: Изд-во Московск. ун-та, 1952. – 542 с.

3.Зимин, А.А. Новое известие о восстании Михаила Глинского в 1508 году/ А.А. Зимин // Советские архивы. – 1970. – №5. – С.68 – 73.

4.Зимин, А.А. Россия на рубеже XV – XVI столетий: Очерки социально-политической истории/ А.А. Зимин. – М.: Мысль, 1982. – 333 с.

5.Исторические связи народов СССР и Румынии в XV –начале XVIII в.: Документы и материалы в 3-х томах. – М.: Наука, 1965. – Т.1: 1408 – 1632. – 364 с.

6.Кром, М.М. Меж Русью и Литвой: западнорусские земли в системе русско-литовских отношений конца XV – первой трети XVI в./ М.М. Кром. – М.: Археографический центр, 1995. – 304 с.

7.Литовская метрика = Lietuvos metrica/ Ин-т истории Литвы. – Вильнюс: Mokslo ir ehcikloediju leidykla, 1995. – Кн. 8: Книга записей (1499 – 1514)/ [Подгот. А. Балюлис и др.]. – 708 с.

8.Любавский, М.К. Литовско-русский сейм: Опыт по истории учреждения в связи с внутренним строем и внешнею жизнью государства/ М.К. Любавский. – М.: Изд-во Имп. О-ва Ист. и Древн. Рос. при Моск. ун-те, 1900. – 850, 232 с.

9.Материалы для истории взаимных отношений России, Польши, Молдавии, Валахии и Турции в XIV–XVIвв., собранные В.А.Уляницким. – М.: Универс. тип-я, 1887. – VII; 244 с.

10. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). КМФ-18. Воп. 1. Спр. 5.

11. НГАБ. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 7.

12. НГАБ. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 8.

13. НГАБ. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 15.

14. НГАБ. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 19.

15. НГАБ. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 588.

16. Памятники дипломатических сношений Московского государства с Крымскою и Ногайскою ордами и Турцией. – Т. 1: 1474 – 1505. Эпоха монголо-татарского ига/ Под ред. Г.Ф. Карпова// Сборник Императорского Русского Исторического Общества. – СПб.: Типография Ф. Елеонского, 1884. – Т. 41. – XXII, 558 с.

17. Памятники дипломатических сношений Московского государства с Польско-Литовским. – Т. 1: 1487 – 1533 / Под ред. Г.Ф. Карпова// Сборник Императорского Русского Исторического Общества. – СПб.: Типография Ф. Елеонского, 1882. – Т. 35. – VI, 869, XII с.


Библиотека БГУИР

18. Хорошкевич, А. Л. Русское государство в системе международных отношений конца XV – начала XVI в./ А.Л. Хорошкевич. – М.: Наука, 1980. – 293 с.

19. Хроника Быховца/ АН СССР, Ин-т истории// Полное собрание русских летописей. – М.: Наука, 1975. – Т. 32. – С. 164 – 173.

20. Historia dypłomacji Polskiej (połowa X-XX w.): W 5 t. / Polski Institut Spraw Międzynarodowych. Pod red. G. Łabudy. – Warszawa: PWN, 1982. – T. 1: połowa X w. – 1572 / M. Biskup, K. Gorski, Z. Kaczmarczyk, G. Łabuda, Z. N. Nowak, K. Zelewski. Pod red. M. Biskupa. – 875 s.

Библиотека БГУИР